**Дадатак да Пастановы Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ад 18.12.2003 № 108**

Пералік лаўрэатаў прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 2003 года
(12 прэмій у памеры 180 базавых велічынь)

У галіне прыродазнаўчых навук

**Яблонскі Г.П.**, доктар фізіка-матэматычных навук, загадчык лабараторыі Інстытута фізікі імя Б.І.Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, **Гурскі А.Л.**, доктар фізіка-матэматычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік таго ж інстытута, **Луцэнка Е. У.**, кандыдат фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік таго ж інстытута –
за цыкл работ "Паўправадніковыя лазеры сіняга УФ-дыяпазону на аснове эпітаксіяльных слаёў і квантавразмерных гетэраструктур селениду цынку і нітрыду галію"

**Архіпенка У.І.**, доктар фізіка-матэматычных навук, загадчык лабараторыі Інстытута малекулярнай і атамнай фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, **Пісараў У.А.**, кандыдат фізіка-матэматычных навук, навуковы супрацоўнік таго ж інстытута, **Сімончык Л.У.**, доктар фізіка-матэматычных навук, галоўны навуковы супрацоўнік таго ж інстытута – за цыкл работ "Нелінейныя працэсы і іх роля ў паглынанні і адлюстраванні электрамагнітнага выпраменьвання неаднароднай плазмай"

**Гілеп А.А.**, кандыдат хімічных навук, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут біяарганічнай хіміі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі", **Струшкевіч Н.У.**, малодшы навуковы супрацоўнік той жа ўстановы, **Чудаеў М.У.**, кандыдат хімічных навук, навуковы супрацоўнік той жа ўстановы – за цыкл навуковых работ "Генетычная і бялковая інжынерыя ў высвятленні структуры і механізму дзеяння сістэм біясінтэзу найважнейшых біярэгулятараў"

**Давыдзенка А.Г.**, доктар біялагічных навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, **Даніленка М.Г.**, кандыдат біялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – за манаграфію "Свет геномаў арганэл"

**Сакалоў З.М.**, доктар медыцынскіх навук, дырэктар дзяржаўнай установы "Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр гігіены", **Федаровіч З.У.**, доктар медыцынскіх навук, загадчык аддзела прафпаталогіі той жа ўстановы – за цыкл навуковых работ "Экалогія і здароўе"

**Нікандраў У.М.**, доктар біялагічных навук, прафесар, загадчык лабараторыі Інстытута фізіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, **Пыжова Н.С.**, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы

“Навукова-даследчы інстытут эпідэміялогіі і мікрабіялогіі” Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, кандыдат біялагічных навук – за цыкл навуковых работ “Новыя механізмы рэгуляцыі пратэялітычных рэакцый на малекулярным і клеткавым узроўні”

У галіне тэхнічных навук

**Жданок С.А.**, доктар фізіка-матэматычных навук, галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, **Дабрэга К.В.**, кандыдат фізіка-матэматычных навук, загадчык лабараторыі Інстытута цепла- і масаабмену імя А.У.Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – за манаграфію “Фізіка фільтрацыйнага гарэння газаў”

**Кажура Л.М.,** доктар тэхнічных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, **Мрочак Ж.А.**, доктар тэхнічных навук, прафесар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта – за цыкл работ “Распрацоўка навуковых асноў стварэння прагрэсіўных тэхналагічных працэсаў, абсталявання і інструмента для машынабудаўнічай вытворчасці Рэспублікі Беларусь”

У галіне аграрных навук

**Бялкоўскі У.І.**, доктар сельскагаспадарчых навук (пасмяротна), **Ліхацэвіч А.П.**, доктар тэхнічных навук, прафесар, член-карэспандэнт, дырэктар Інстытута меліярацыі і лугаводства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, **Мeяроўскі А.С.,** доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, намеснік дырэктара таго ж інстытута – за цыкл работ па захаванні і рацыянальным выкарыстанні тарфяных глеб Беларусі

**Васілюк Г.В.**, кандыдат сельскагаспадарчых навук, загадчык сектара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства “Інстытут глебазнаўства і аграхіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”**, Клебановіч М.В.**, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт кафедры глебазнаўства і аграхіміі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – за цыкл работ “Навуковыя асновы вапнавання глеб”

У галіне гуманітарных навук

**Шарая В.М.**, доктар філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – за цыкл работ “Ушанаванне продкаў у духоўнай культуры славян: аксіялогія, сімволіка, трансфармацыя”

**Максімовіч В.А.,** доктар філалагічных навук, першы прарэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў – за цыкл работ “Беларуская літаратура пачатку XX ст.: наватарскія эстэтычныя пошукі і творчыя здабыткі”

**Лаўрэаты прэміі для маладых вучоных**
(7 прэмій у памеры 60 базавых велічынь)

**Міхневіч С.Ю.,** кандыдат фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі імя Б.І.Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – за работу “Эфекты моцнай аптычнай нелінейнасці ў кандэнсаваных асяроддзях і іх дадаткі”

**Антончык А.П.,** аспірант, **Канстанцінава В.В.**, кандыдат хімічных навук, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – за работу па даследаванні біясінтэзу брасінастэроідаў

**Молчан В.В.**, кандыдат біялагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута фотабіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – за работу “Другасныя медыятары і рэгуляцыя цытаплазматычнай канцэнтрацыі кальцыю ў раслінай клетцы”

**Салавей І.А.,** малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута заалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – за работу “Ландшафтная дэтэрмінаванасць структуры згуртавання дробных млекакормячых і драпежнікаў іх спажыўцоў у хвойна-дробналісцёвых комплексах паўночнай паловы Беларусі”

**Гарбуноў В.А.,** кандыдат медыцынскіх навук, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі дзяржаўнай установы “Навукова-даследчы інстытут эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, **Слізень В.В.,** асістэнт кафедры Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта – за цыкл работ “Маніторынг рэзістэнтнасці ўзбуджальнікаў гнойна-септычных інфекцый у Рэспубліцы Беларусь”

**Грынчук П.С**., малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – за цыкл публікацый “Перкаляцыйныя з’явы ў працэсах цеплапераносу ў структурна-разупарадкаваных гетэрагенных асяроддзях”

**Груша А.І**., кандыдат гістарычных навук, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – за цыкл работ па методыцы навуковага выдання гістарычных крыніц і публікацый матэр’ялаў Метрыкі Вялікага княства Літоўскага

Лаўрэаты прэміі за студэнцкую навуковую работу
(7 прэмій у памеры 40 базавых велічынь)

**Люціч А.А.**, студэнт фізічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – за работу “Анізатропныя аптычныя ўласцівасці порыстага аксіду алюмінію”

**Новік Н.В.**, студэнтка факультэта радыёэлектронікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі – за работу “Транспарт носьбітаў зараду ў малекуле ДНК”

**Лукашэвіч С.М.,** студэнт фізічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – за работу “Электронна-транспартныя ўласцівасці і пераход Андэрсана ў плёнках полііміда, імплантаваных іонамі кобальту”

**Рахуба Г.М**., студэнтка біялагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – за работу “Уплыў вытворных тыатэтронавай кіслаты на актыўнасць фосфаліпазы $A_2$ ў adносінах да фосфаліпідаў у міцэлярнай фазе”

**Рабцаў А.Г**., студэнт магістратуры фізічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – за работу “Дынаміка і працэсы рэкамбінацыі паўправадніковых лазераў для ІК- і бачных дыяпазонаў”

**Красачка П.П.**, студэнт факультэта ветэрынарнай медыцыны ўстановы адукацыі “Віцебская ордэна “Знак Пашаны” дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны” – “Новыя падыходы да актывізацыі імуннай сістэмы і абменных працэсаў арганізма жывёл і птушак”

**Шамякіна С.В**., студэнтка філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – за зборнік навуковых прац “ Verbo tenus” (У прасторы слова): Філалагічныя эцюды”

**Заахвочвальная прэмія НАН Беларусі 2003 года**

за студэнцкую навуковую работу

(1 прэмія ў памеры 20 базавых велічынь)

**Брэль А.**Г., студэнт установы адукацыі “Мозырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт” – за работу “Эвалюцыя тэарэтыка-метадалагічных асноў беларускага антыказнаўства”. (1917-2000 гады)”